Упраўленне па адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна г.Мінска
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа № 2 г.Мінска”

# “Сінтаксічныя нормы: дапасаванне і кіраванне ў беларускай мове”

Намінацыя
“Распрацоўка ўрока з выкарыстаннем тэхналогій штучнага інтэлекту”

Аўтар: Павядайка В.Р.
настаўнік беларускай
мовы і літаратуры
вышэйшая
кваліфікацыйная
катэгорыя

Мінск, 2025

Пашпарт распрацоўкі

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Аўтар распрацоўкі | Павядайка Вольга Рыгораўна<br>настаўнік беларускай мовы і літаратуры, ДУА "Сярэдняя школа № 2 г.Мінска", вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі<br>80333583828 |
| 2. | Тэма ўрока | Сінтаксічныя нормы: дапасаванне і кіраванне ў беларускай мове |
| 3. | Клас | 11 |
| 4. | Кароткая анатацыя ўрока | Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне пачынаецца з памяці пра подзвіг народа ў гады ВАВ. На розных этапах урока згодна з пастаўленымі мэтамі выкарыстоўваю іскрынкі-гэта розныя заданні, у тым ліку створаныя пры дапамозе штучнага інтэлекту, якія вызываюць у вучняў цікавасць, актывізуюць іх пазнавальную дзейнасць. Выкарыстоўваю міжпрадметныя сувязі з беларускай літаратурай, гісторыяй Беларусі. У час правядзення ўрока прымяняю розныя метады (наглядны, слоўны, практычны), элементы тэхналогіі праблемнага навучання. Часткова-пошукавая работа рэалізуецца праз групавую дзейнасць з улікам узроставa-інтэлектуальных асаблівасцей вучняў. Навізна дадзенага ўрока заключаецца ў пераасэнсаванні традыцыйных метадаў навучання з улікам педагагічнай дыдактыкі, індывідуальна – творчых магчымасцей і матываў вучняў, а таксама ў камбінацыі элементаў розных методык, выкарыстання магчымасцей штучнага інтэлекту ў распрацоўцы спецыяльных практыкаванняў, якія забяспечваюць аптымальнае развіццё метапрадметнай, тэкставай, камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў. |
| 5. | Тып і форма ўрока | Урок удасканалення ведаў, уменняў і навыкаў; урок-квэст |
| 6. | Апісанне выкарыстаных тэхналогій штучнага інтэлекту | На ўроку былі выкарыстаны наступныя тэхналогіі штучнага інтэлекту:<br>Copilot– штучны інтэлект ад Microsoft, прызначаны для дапамогі ў тэкставых і крэатыўных задачах, аналізе інфармацыі і гутарках. Ён можа генераваць тэксты, аналізаваць дадзеныя.<br>Рое – платформа, якая дае доступ да розных нейрасетак ад розных кампаній. Дазваляе карыстальнікам эксперыментаваць з рознымі штучнымі інтэлектамі і выбіраць найбольш падыходныя для сваіх задач.<br>Шедеврум – нейрасетка, арыентаваная на створённые мастацкіх і літаратурных тэкстаў. Выкарыстоўваецца для генерацыі паэзіі, прозы і крэатыўнага кантэнту. |

| | |
|---|---|
| | Гамма – гэты ШІ ўжываецца для аналізу і апрацоўкі тэкстаў, можа дапамагаць у стварэнні прэзентацый, справаздач і аўтаматызацыі працы з інфармацыяй. |
| 7. Чакаемыя вынікі ўрока | Прагназуецца, што вучні ўспомняць і пашыраць веды пра сінтаксічныя нормы, віды падпарадкавальнай сувязі, навучацца правільна ўжываць словазлучэнні ў маўленні, а выкарыстанне штучнага інтэлекту зробіць навучанне больш займальным і эфектыўным.<br>Урок паспрыяе выхаванню калектывізму, узаемадапамогі.<br>Вучні яшчэ раз успомняць пра подзвіг нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама даведаюцца пра невядомыя старонкі гісторыі, што павінна абудзіць патрыятычныя пачуцці ў маладога пакалення, паўздзейнічаць на пачуцці юнага грамадзяніна. |
| 8. Выкарыстаная літаратура і інтэрнэт-рэсурсы | 1. https://knihi.com.Ales_Adamovic<br>2. https://knihi.com.Posuki_buducyni<br>3. https://knihi.com.Semnaccatay_vysnoy<br>4. https://knihi.com.Serca_na_daloni<br>5. https://knihi.com.Znak_biady<br>6. Беларуская мова : вучэб.дапам. для 11-га кл. устаноў сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М.Валочка і інш.- Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021.-183 с.<br>7. Беларуская мова : поўны школьны курс : тэорыя : дапам. для вучняў ст.кл.устаноў агул.сярэд.адукацыі / В.П.Красней, Я.М. Лаўрэль. – 6-выд., дапрац. – Мінск : Аверсэв, 2013. -287 с.<br>8. Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны 10-11 классы // учебное пособие для учащихся учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2023. – 63 с. |

Тэма: Сінтаксічныя нормы: дапасаванне і кіраванне ў беларускай мове (11 клас)
Мэты:

- дапамагчы вучням узнавіць і пашырыць веды пра асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове;
- развіваць уменне правільна ўжываць словазлучэнні ў маўленні;
- выхоўваць уважлівасць да сінтаксічных норм беларускай мовы;
- выхоўваць калектывізм, узаемадапамогу, гонар за подзвіг нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Тып урока: урок удасканалення ведаў, уменняў і навыкаў
Форма ўрока: урок-квэст
Педагагічная тэхналогія: калектыўна-ўзаемнага навучання
Абсталяванне: прэзентацыя, мабільныя тэлефоны, вучэбны дапаможнік для 11-га класа, карткі з заданнямі, шэсць ключоў, QR-код.

**Ход урока**

Клас дзеліцца на групы.

**I. Арганізацыйны момант (5 хвілін)**

Настаўнік. “Вялікую праўду аб мінулай вайне суджана выказаць толькі яе ўдзельнікам або сведкам. Іншым гэта не дадзена. Іншыя могуць ствараць нават геніяльныя творы, але гэта ўжо будзе з поваду вайны, а не яе горкай і крывавай праўдай”. Гэтыя словы вядомага беларускага пісьменніка Васіля Уладзіміравіча Быкава, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны. Партрэт пісьменніка перад вамі, а па Q-кодзе можна даведацца больш інфармацыі пра асобу пісьменніка. Што адчуваў пісьменнік, калі пісаў для чытача гэтыя радкі? (Адказы вучняў).

- А давайце зараз паспрабуем спытацца ў штучнага інтэлекту, што ён нам адкажа. (Выкарыстанне нейрасеткі Copilot)






- Н. Сапраўды, Васіль Быкаў лічыў, што праўду пра вайну могуць напісаць толькі яе ўдзельнікі.

II. **Матывацыйны этап. (2 хвіліны)**

Настаўнік. Ордэн, дрот, цукар, ганак, рукзак, футляр- гэтыя словы мы выкарыстоўваем у штодзённым жыцці. Аднак не кожны ведае, што яны запазычаны з нямецкай мовы. Сёння я запрашаю вас прыняць удзел у сакрэтнай аперацыі “Шэсць крокаў да Перамогі…”.




**“Легенда аперацыі”.** Ваеннае камандаванне атрымала інфармацыю, што дзесьці на тэрыторыі Беларусі вораг схаваў сакрэтную зброю. *Задача*: знайсці яе і выкарыстаць з мірнымі мэтамі. *Умовы*: зброя знаходзіцца пад шасцю замкамі ў скарбніцы продкаў, ключы ад іх схаваны ў шасці пунктах гісторыка-культурнага значэння. Вам патрэбна адшукаць скарбніцу і рассакрэціць зброю. Вы ўтварылі чатыры каманды. Аднак да канечнага пункта прыйдзе толькі адна. Каманду-пераможцу чакае вышэйшая ўзнагарода. Каманды, якія пры выкананні аперацыі праявяць мужнасць, кемлівасць, эрудыцыю, таксама будуць узнагароджаны адзнакамі розных ступеней!

Каманды праходзяць шэсць этапаў з заданнямі. Ключ атрымае тая каманда, якая лепш справіцца з заданнем. На выкананне кожнага задання даецца тры хвіліны. Месца знаходжання ключа зашыфравана ў тэкстах заданняў. Камандам, якія не паспелі першымі выканаць заданне, для допуску да наступных этапаў прызначаецца “штрафное” заданне.

**II. Актуалізацыя ведаў, уменняў і навыкаў.**

***I этап*. Разведка.**

**Мемарыяльны комплекс “Красны бераг”. (3 хвіліны)**



Мемарыял прысвечаны дзецям, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
На месцы мемарыяла падчас вайны знаходзіўся адзін з найбуйнейшых дзіцячых донарскіх канцлагераў, дзе фашысты сілком адбіралі дзяцей ад мацярок ў Добрускім, Жлобінскім, Рагачоўскім і іншых раёнах вобласці. Затым дзяцей адпраўлялі ў зборны пункт, праводзілі збор крыві для параненых нямецкіх афіцэраў, а пасля гэтага высылалі на цяжкія работы ў правінцыі Германіі.
Адкрывае мемарыял скульптура дзяўчынкі, якая стаіць самотна пасярод плошчы. Цэнтрам кампазіцыі мемарыяльнага ансамбля з'яўляецца «Плошча Сонца». Па цэнтры плошчы высаджаны яблыневы сад, ад якога у розныя бакі разыходзяцца алеі - прамяні гэтага сонца. Адзін з прамянёў чорнага колеру, ён праходзіць праз пусты клас з белых парт і школьнай дошкі, дзе знаходзяцца вітражы з малюнкамі дзяцей, выкананых у канцлагерах, і носіць назву «Прамень памяці». Па цэнтры дошкі мара дзяцінства - «Белы парусьнік».

**Заданне 1.** Выпішыце з тэксту словазлучэнні ў табліцу [6]

| **Дапасаванне** | **Кіраванне** | **Прымыканне** |
|---|---|---|
| Дапасаванне – сувязь, пры якой залежнае слова ставіцца ў тых жа формах роду, ліку і склону, што і галоўнае; залежнае слова можа быць прыметнікам, дзеепрыметнікам, парадкавым лічэбнікам, абагульнена-якасным займеннікам. Сродкам выражэння дапасавання з’яўляецца канчатак залежнага слова. | Кіраванне- спосаб падпарадкавальнай сувязі, пры якім залежнае слова ставіцца ў пэўнай склонавай форме. Здольнасцю кіраваць валодаюць дзеясловы і іх формы. Сродкі выражэння кіравання – канчатак залежнага слова і прыназоўнік. | Прымыканне – падпарадкавальная сувязь, пры якой залежнае слова звязваецца з галоўным толькі па сэнсе і інтанацыйна. Прымыкаюць нязменныя знамянальныя словы: прыслоўі, інфінітывы, дзеепрыслоўі. Галоўным словам словазлучэння з прымыканнем можа быць дзеяслоў, назоўнік, прыметнік. |
| | | |

Ключавое слова: *героі*. Ключ знаходзіцца на паліцы з выставай “Славутыя людзі Беларусі”.

Каманды, што прайгралі, у гэты час выконваюць “штрафное” заданне.

**“Штрафное” заданне**. “Літаратурнае рэшата”. Устанавіце адпаведнасць паміж літаратурнымі творамі і словазлучэннямі з гэтых твораў. Вызначце від словазлучэння. **(2 хвіліны)**

1. Хутарская сядзіба; 2. Волеччын голас; 3. галубіныя чародкі; 4. школьныя экзамены; 5. памяць пра фашызм;
2. Аўтары і творы: 1. В.Быкаў “Знак бяды” [5], 2. К.Чорны “Пошукі будучыні” [2], 3. І.Шамякін “Сэрца на далоні” [4], 4. І.Навуменка “Сямнаццатай вясной” [3], 5. А.Адамовіч, Я.Брыль, У.Калеснік “Я з вогненнай вёскі” [1].

***II этап*. Шыфроўка. (3 хвіліны)**

- Што такое шыфр? (*Сістэма знакаў для сакрэтнага пісьма*)
- Якія вы можаце назваць знакі? (*Іерогліфы, малюнкі, лічбы, літары*)







Настаўнік. Наш агент пакінуў  шыфроўку. Вам патрэбна яе расшыфраваць.
**Заданне 2.** У тэксце “Бабруйская крэпасць” расшыфруйце інфармацыю:
1. від сувязі ў словазлучэнні дапасаванне;
2.кіраванне
3.прымыканне
4.словазлучэннем не з’яўляецца.
Ключавое слова: *лісты з фронту* (ключ знаходзіцца ў канверце з лістом з фронту).
Каманды, што прайгралі, выконваюць “штрафное” заданне.
**“Штрафное” заданне.** Суаднясіце лічбы з літарамі алфавіту і прачытайце выслоўе. ( Ніколі не забудзем!) **(2 хвіліны)**
15,10,12,16,13,10, 15, 6, 9,1,2,21,5,9,6,14!
**Фізкультхвілінка**
**III этап. Сапёры.** Прыём “Белыя плямы”. **(3 хвіліны)**
**Заданне 3**. Запоўніць “Белыя плямы”. Разгадайце аўдыякрыжаванку “Песні на словы беларускіх паэтаў”. (Інтэрактыўнае заданне LearningApps)
(Заданне створана да ўрока з дапамогай штучнага інтэлекту POE)
Паслухайце ўрыўкі з песень і напішыце прозвішчы паэтаў- аўтараў слоў.
Заданні аўдыякрыжаванкі даступны па QR-кодзе.



- Ключавое слова: паэт. Ключ на паліцы, прысвечанай беларускім паэтам.
- А зараз працягнем нашу аперацыю “Шэсць крокаў да Перамогі”.

**“Штрафное” заданне**. **(3 хвіліны)**

Стварыце слоган, які адлюстроўвае ідэю ўрока, выкарыстоўваючы магчымасці штучнага інтэлекту. (Вучні выкарысталі нейрасеткі GPT, o3, GPT4)










***IV этап***.Гісторыкі **(3 хвіліны)**




**Заданне 4.** Вядома, што байцы Брэсцкай крэпасці мужна трымалі абарону. Нельга не ўспомніць і пра Брэсцкі вакзал.

Рашыце прыклады і стварыце стужку часу, успомніце значныя падзеі.

((91*3)+23+92)*5=…(1940)

47*24+816=… (1944)

(456+515)*2=…(1942)

(151-84)*29=…(1943)

Ключавое слова: *лічба* (ключ пад выставай карцін М. Савіцкага “Лічбы на сэрцы”)

**“Штрафное” заданне.** Адзначце словазлучэнні, якія правільна перакладзены на беларускую мову. **(2 хвіліны)**

1. Три высоких здания - тры высокіх будынкі;
2. Идти за продуктами - ісці па прадукты;
3. Глубже океана - глыбей акіяна.

***V этап*. Павуцінне (3 хвіліны)**

## Партызанскі рух

- Перад вамі карта партызанскіх брыгад і злучэнняў Беларусі.

Мала хто ведае, але ў савецкіх партызан было вышэйшае кіраўніцтва ў асобе маршала Клімента Варашылава. Для яго нават было прыдумана спецыяльнае званне – Галоўнакамандуючы партызанскім рухам. Неўзабаве гэта пасада была скасавана. У 1942 годзе быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху, які ўзначаліў П.К. Панамарэнка. Штаб каардынаваў дзейнасць партызан, даводзіў загады, выдаваў зводкі і г.д. Увогуле, рабілася ўсё для забеспячэння баяздольнасці і разгарнення партызанскага руху.




**Заданне 5**. Выканайце разбор словазлучэння (злучыце лініямі правільныя характарыстыкі словазлучэння, утварыўшы такім чынам павуцінку)




**Тысячамі дарог** і ў розных кірунках збягае вясною снегавая вада.

Ключавое слова: *вада* (ключ знаходзіцца пад бутэлькаю з вадою).

**"Штрафное" заданне**. Разбярыце словазлучэнне "шалясцелі лісцем". Падкрэсліце патрэбныя характарыстыкі. **(3 хвіліны)**

1.Простае, складанае.

2. Свабоднае, непадзельнае.

3. Дапасаванне, кіраванне, прымыканне.

4.Іменнае, дзеяслоўнае, прыслоўнае.

5. Азначальнае, аб'ектнае, акалічнаснае.

***VI этап*. Неймінг** (прыдумаць назву) **(3 хвіліны)**

22 чэрвеня 1941 г. быў выраблены экстраны нумар "Красноармейской правды" з весткай аб вераломным нападзе фашыстаў на СССР. Рэдакцыя газеты

размяшчалася ў спеццягніку. Асаблівая старонка ў біяграфіі газеты – гэта ўдзел ваенных журналістаў у манеўрах і вучэннях, якія праходзілі на тэраторыі Беларускай ваеннай акругі: “Днепр”, “Нёман”, “Дзвіна”, “Бярэзіна” і інш.








**Заданне 6**. Выкарыстоўваючы штучны інтэлект ШЕДЕВРУМ, намалюйце карцінкі, якія адлюстроўвалі ваеннае жыцце і дайце ім назвы. Кожная назва павінна з’яўляцца словазлучэннем з рознымі відамі сувязі (дапасаванне, кіраванне, прымыканне).

Ключавое слова: *пісьмо* (ключ пад стосам сшыткаў).

Каманда, якая зарабіла больш ключоў, перамагае, атрымлівае ручкі ў падарунак.

**Рэфлексія (3 хвіліны)**

“Тэлеграма з мінулага”

Настаўнік. Кожнаму з вас прыйшла тэлеграма з пажаданнямі.

Дарагія хлопчыкі і дзяўчынкі! Жывіце ў міры, у згодзе, радуйцеся сонцу і жыццю. Помніце пра тое, якой цаной дасталася Вялікая Перамога. Мы змагаліся плячо ў плячо, для таго, каб вы шчасліва жылі. Любіце родную зямлю, шануйце нашу святую Бацькаўшчыну.

“Тэлеграма-падзяка”. Напішыце словы падзякі для ветэранаў вайны.

**III. Выстаўленне адзнак (2 хвіліны)**

**IV. Агучванне дамашняга задання (2 хвіліны)**

**Заданні на выбар вучняў:**

1.Напісаць сачыненне-разважанне “Чым блізкае мне свята Дзень Перамогі?”;

2.Пры дапамозе штучнага інтэлекту GAMMA падрыхтаваць міні-прэзентацыю “Віды сувязі ў словазлучэнні. Асаблівасці кіравання ў беларускай мове” (у якасці прыкладаў выкарыстаць словазлучэнні на ваенную тэматыку).

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. https://knihi.com.Ales_Adamovic
2. https://knihi.com.Posuki_buducyni
3. https://knihi.com.Semnaccatay_vysnoy
4. https://knihi.com.Serca_na_daloni
5. https://knihi.com.Znak_biady
6. Беларуская мова : вучэб.дапам. для 11-га кл. установў сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М.Валочка і інш.- Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021.-183 с.

7. Беларуская мова : поўны школьны курс : тэорыя : дапам. для вучняў ст.кл.устаноў агул.сярэд.адукацыі / В.П.Красней, Я.М. Лаўрэль. – 6-выд., дапрац. – Мінск : Аверсэв, 2013. -287 с.
8. Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны 10-11 классы // учебное пособие для учащихся учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2023. – 63 с.